колькасці перакладаў аўтарызаваных няшмат. *Т.К.Грамадчанка.*

**АЎТАТЫ́ПІЯ** (ад *аўта...* + грэч. typos адбітак), спосаб паліграфічнага ўзнаўлення паўтонавых і шматколерных відарысаў (фотаздымкаў, твораў жывапісу) сродкамі *высокага друку*; адзін з найб. пашыраных відаў *рэпрадукцыі*, тонавая цынкаграфія. Арыгінал, што трэба ўзнавіць, фатаграфуюць праз растр, лініі якога ствараюць на фатаграфічнай пласціне цені і паўцені. За празрыстай адтулінай растра праектуецца адлюстраванне дыяфрагмы ў выглядзе светлай кропкі. Колькасць святла, адбітага ад арыгінала, уплывае на памеры кропак: найб. светлым месцам адпавядае найменшы дыяметр кропак. Пасля капіравання растравага негатыва на цынкавую пласціну з нанесеным святлоадчувальным слоем атрымліваюць аўтатыпнае (растравае) клішэ — рэльефнае пазітыўнае адлюстраванне. Шматколернае адлюстраванне аднаўляецца на аснове фатаграфічнага колерападзелу: прамяні святла, адбітыя ад арыгінала, паслядоўна прапускаюць праз рознакаляровыя святлафільтры. Пасля 3- ці 4-разовага фатаграфавання атрымліваюць колерападзельныя растравыя негатывы, з якіх вырабляюць аўтатыпныя клішэ. З іх паслядоўна асн. фарбамі друкуюць шматкаляровую рэпрадукцыю.

**АЎТО́ГРАФ** (ад *аўта...* + грэч. graphō пішу), 1) тэкст мастацкага твора, навуковай працы, запісак, пісем і інш., напісаны або набраны самім аўтарам. А. вывучаюцца і зберагаюцца ў архівах, музеях, рукапісных аддзелах бібліятэк, у прыватных асоб. З'яўляюцца крыніцай кананічнага (прызнанага правільным) тэксту, даюць магчымасць прасачыць творчы працэс стварэння твора. 2) Уласнаручны надпіс, подпіс.

**АЎТУХО́ВІЧ** Таццяна Яўгенаўна (н. 19.1.1951, г. Гродна), беларускі літаратуразнавец. Д-р філал. навук (1998), праф. (2005). Скончыла БДУ (1974). Настаўнічала. З 1982 у Гродзенскім ун-це (з 1998 заг. кафедры). Даследуе тэарэт. і гіст. паэтыку, рыторыку і л-ру, гісторыю рус. л-ры 18—20 ст. Аўтар навук. прац «Літаратурная творчасць Феафана Пракаповіча» (1981), «Рускі раман 18 стагоддзя і рыторыка: узаемадзеянне ў перыяд фарміравання жанру (1760—1770-я гг.)» (1998), дапаможнікаў для ВНУ.

*Тв.*: Античная риторика: учеб. пособие. Гродно, 2003; Поэзия риторики: очерки теоретической и исторической поэтики. Минск, 2005. *В.В.Давідовіч.*




*У час правядзення ўсебеларускага фестывалю народнага гумару «Аўцюкі».*

**АЎТЭНТЫ́ЧНЫ ФАЛЬКЛО́Р**, неапрацаваны фальклор, які існуе толькі ў жывым бытаванні. Носьбітамі А.ф. звычайна з'яўляюцца людзі старэйшага і сярэдняга ўзросту: спевакі, майстры ігры на нар. муз. інструментах, казачнікі, якія, як правіла, жывуць у сельскай мясцовасці і добра ведаюць вусна-паэт. творы, нар. танцы, абрады і звычаі сваёй вёскі, раёна ці рэгіёна. У час выканання твораў А.ф., якія заўсёды рэгламентаваны канкрэтнай падзеяй, рытуалам, звычаем, абрадам, адсутнічае падзел паміж выканаўцамі і слухачамі (гледачамі). І першыя, і другія ўвесь час мяняюцца ролямі. Адметнасцю выканання твора А.ф. з'яўляецца таксама імправізацыя, якая праяўляецца ў тым, што кожны ўдзельнік калект. творчасці, а таксама сам выканаўца заўсёды ўзнаўляе фалькл. твор па-новаму, улічваючы канкрэтныя абставіны, аўдыторыю. Менавіта таму, напр., немагчыма дакладна запісаць на нотным стане нар. песню не толькі ў калект., але і ў сольным выкананні. Сённяшнія сац., культ. і інш. передумовы жыцця не садзейнічаюць існаванню ў жывым бытаванні А.ф. Працэс урбанізацыі, развіцця тэхн. прагрэсу, знікненне ўмоў для існавання А.ф. нарадзілі новую форму выкарыстання фалькл. традыцыі, якая ў навуцы атрымала назву *фальклорызм*.

*Літ.*: Конан У.М. Ля вытокаў самапазнання: станаўленне духоўных каштоўнасцей у святле фальклору. Мінск, 1989; Аляхновіч А.М. Народная песня ў школе. Мінск, 2004.

*А.М.Аляхновіч, З.Р.Шышла.*

**«АЎЦЮКІ́»**, усебеларускі фестываль народнага гумару. Праводзіцца з 1995 у вёсках Вялікія і Малыя Аўцюкі Калінкавіцкага р-на 1 раз у 2—3 гады. Заснавальнікі — Мін-ва культуры Рэспублікі Беларусь, Гомельскі аблвыканком, Калінкавіцкі райвыканком,